**Скуматаў, І.** Барацьбу ўзначалілі камуністы / І. Скуматаў // Прамень камунізма (Гарадок). – 1964. – 4 ліп. – С. 2.

## БАРАЦЬБУ ЎЗНАЧАЛІЛІ КАМУНІСТЫ

Уварваўшыся на тэрыторыю нашай Радзімы, нямецка-фашысцкія захопнікі палілі гарады і вёскі, разбуралі калгасы, саўгасы, МТС, знішчалі мірнае насельніцтва. Ніколі не забудуцца зверствы фашыстаў і на тэрыторыі нашага раёна. Больш 300 чалавек састарэлых і дзяцей вёскі Сінякі Кудзінскага сельсавета былі сагнаты ў адзін хлеў і жыўём спалены. У папялішча былі ператвораны вёскі Мяжа, Плеханы, Скураты, Баброва, Бярозаўка і многія іншыя. Ды хіба ўсё пералічыш!

Але савецкія людзі, зведаўшы плён свабоднай працы, не сагнулі перад захопнікамі галовы, падняліся на справядлівую барацьбу з ворагам. Бясстрашныя партызаны ні днём, ні ноччу не давалі спакою фашыстам. Зямля гарэла пад нагамі ворага.

Арганізоўвалі і накіроўвалі барацьбу народных мсціўцаў камуністы. Для падпольнай работы ў тыле ворага былі пакінуты лепшыя сілы партыі. Камуністы выкрывалі хлуслівую прапаганду гітлераўцаў, што Чырвоная Армія разгромлена, што з Саветамі пакончана.

Народ наш верыў у моц Савецкай улады, усімі сродкамі і сіламі садзейнічаў разгрому заклятага ворага. На заклік падпольнага райкома партыі насельніцтва ішло ў партызанскія атрады і гераічна змагалася з нямецкімі акупантамі. Гераічна грамілі варожыя гарнізоны і камунікацыі Скрыпко А. Я., Лябёдка І. З., Афанасьеў І. Р., Сяліцкі К. І., Кірыёнак С. Ф., Косаў А. П., Маза І. І. і многія, многія іншыя.

А хіба гэта не актыўная барацьба з ворагам, калі вёскі бралі поўнасцю на сваё забеспячэнне партызанскія атрады, забяспечвалі іх харчаваннем, адзеннем. Ніколі не забудзецца ў памяці подзвіг камсамолкі, старшыні калгаса вёскі Сінякі Надзеі Нікіцінай. Яна арганізоўвала збор хлеба, сала, круп, бульбы ў вёсках Саладухі, Сінякі, Марчанкі, Воблы, Батракі і адпраўляла партызанам. Абозы з прадуктамі, сабраныя ёю, даходзілі да Вярэчча. Адважная патрыётка папала ў рукі ворага. Але як ні катавалі гітлераўскія захопнікі, Нікіціна не выдала партызан, памерла як герой.

Другая Беларуская партызанская брыгада трымала пад сваім кантролем амаль увесь былы Езярышчанскі раён, большую частку Гарадоцкага і Невельскага раёнаў. Арганізавана была работа сельсаветаў у Паташні, Мяжы, Вярэччы, Кудзінах, Хвошні. Карыстаючыся варотамі на Вялікую зямлю, партызаны арганізавалі работу паштовай сувязі. На часова акупіраваную тэрыторыю ішлі пісьмы, газеты. Савецкія людзі былі рады весткам з Вялікай зямлі, ведалі праўду аб падзеях на франтах Айчыннай вайны. Матэрыялы газет шырока выкарыстоўваліся для палітычнай работы сярод насельніцтва, выкрыцця гітлераўскай прапаганды. Кожнае слова агітатара потым перадавалася з вёскі ў вёску.

Насельніцтва населеных пунктаў, якія кантраляваліся партызанскімі атрадамі брыгады, аказвала дапамогу таксама і байцам Савецкай Арміі. Жыхары Паташынскага, Руднянскага, Езярышчанскага, Вярэцкага сельсаветаў сабралі і адправілі праз Усвяцкія вароты ў дапамогу фронту каля 500 пудоў хлеба, каля 300 галоў жывёлы. На пабудову танкавай калоны было сабрана больш 2 мільёнаў рублёў грошай.

Адчуваючы бяссілле перад партызанамі, гітлераўцы сваю злосць спаганялі над мірным насельніцтвам. Яны расстрэльвалі, вешалі сотні нявінных людзей. Партызаны, камуністы ў такіх

выпадках узмацнялі палітычную работу сярод насельніцтва, растлумачвалі ім задачу, бралі іх пад сваю абарону. Насельніцтва ў сваю чаргу папярэджвала народных мсціўцаў у тых выпадках, калі рыхтаваўся напад гітлераўцаў. Бывалі выпадкі, калі бачачы, што партызаны пасля шматлікіх баёў і пераходаў стаміліся, насельніцтва ахоўвала іх у час адпачынку.

Грамілі нямецкія гарнізоны і камунікацыі партызаны да вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А як быў вызвалены раён, былыя партызаны прыступілі да ўзнаўлення разбуранай вайной гаспадаркі.

Прайшло больш 20-ці гадоў пасля таго, як з раёна былі выгнаны ворагі. Непазнавальнымі сталі нашы вёскі. Рукамі сельскіх працаўнікоў адноўлены калгасы, пабудаваны новыя школы, магазіны, прадпрыемствы.

**І. СКУМАТАЎ,**

**былы начальнік штаба Другой Беларускай партызанскай брыгады**